*Надзея Ясмінска*

# Чароўныя ніткі

## пані Яніны

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2020

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Я81

Мастак
*Надзя Бука*

**Ясмінска, Н.**
Я81 Чароўныя ніткі пані Яніны / Надзея Ясмінска. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2020. — 36 с. : іл.
ISBN 978-985-581-356-0.

Аднойчы на Зарэчнай вуліцы адбылося Надзвычайнае і Таямнічае здарэнне. У самых нечаканых месцах з'явіліся дзікія звяры: ліса ў булачнай, бабёр у газетным кіёску, норка ў ювелірнай краме... А яшчэ недзе разгульвае чорная і калматая пачвара! Дзеці з Зарэчнай вырашылі злавіць яе і разгадаць таямніцу. І нітачкі гэтай заблытанай справы прывядуць іх да чароўнага вязання пані Яніны.
Кніжка рэкамендавана для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-356-0**

© Ясмінска Н., 2020
© Бука Н. І., ілюстрацыі, 2020
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2020

# Рукавы для лап і хвастоў

Ці ведаеце вы пані Яніну? Яна жыве на Зарэчнай вуліцы. Вось толькі назва горада знікла ў мяне з памяці, так што гэта можа быць і ваш горад.

Калі вы раптам убачыце старую вабную жанчыну з маленькімі акулярамі на носе і яркімі стужкамі ў валасах — гэта дакладна будзе яна!

Пані Яніна любіць вязаць на ганку сваёй хаты. «Звычайная справа!» — паціснеце вы плячыма і надумаеце прайсці міма. Але не спяшайцеся. З-пад вязальных спіц пані Яніны выходзяць не шкарпэткі, не рукавіцы, не шалікі і нават не шапкі.



Гэтую дзіўную бабульку наогул не цікавяць рэчы для людзей.

З тонкіх, як павуцінка, і лёгкіх, як аблачынка, нітак яна робіць адзенне для жывёл.

Не трэба смяяцца! Пані Яніна цалкам у сваім розуме. Проста яна ведае тое, што іншым неўздагад: жывёлам не заўсёды хапае ўласнага футра.

Вось кацяня, у якога з-за хваробы вылезла поўсць. Гаспадары не захацелі з ім важдацца і выкінулі на вуліцу. Небарака мёрз узімку, таму пані Яніна звязала яму цёплы швэдар з чатырма рукавамі для лап і пятым для хваста.





А вось бадзяжны сабака, у якога вялікая лысіна на баку, — пэўна ён з кімсьці пабіўся. Нічога, добрая пані зробіць для яго ваўняную латку — ды такую, што і не адрозніш ад роднай шкуры.

Суседзі лічаць пані Яніну чараўніцай, бо з яе нітак шэрсць атрымліваецца як сапраўдная. А яшчэ яна ўмее вязаць крылы для пакалечаных птушак — і тыя зноў уздымаюцца ў неба!

Жыццё пані Яніны спакойнае і ўтульнае, нібы яе прадзіва. Але час ад часу з ёй здараюцца прыгоды. І пра адну з іх вы зараз даведаецеся.

# Нябачны заапарк

Усё пачалося з таго, што адным восеньскім днём на Зарэчную вуліцу завітаў Чмут. Гэта быў худы цыбаты чалавечак, хітры, як ліс, і назойлівы, як муха. Ён соўгаўся туды-сюды і шукаў, чым бы пажывіцца. А паколькі да працы Чмут не меў звычкі, то і «пажывіцца» для яго азначала нешта сцягнуць ці некага падмануць.



# Змест


Рукавы для лап і хвастоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Нябачны заапарк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Таямнічае здарэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Пачвара замест бульбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Што азначае «Рырурыр» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
«Я не вінаваты!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Загадка і разгадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Усе колеры вясёлкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Ясмінска** Надзея
(**Карэліна** Надзея Уладзіміраўна)

# Чароўныя ніткі пані Яніны

Рэдактар *К. С. Голуб*
Адказны за выпуск *Ж. Ю. Клімянок*
Мастак *Н. І. Бука*
Дызайн вокладкі *Г. М. Дубіна*
Камп’ютарная вёрстка *І. П. Бандаровіч*
Карэктар *М. Д. Ліпніцкая*

6+

Падпісана ў друк 06.12.2019.
Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 2,1. Ул.-выд. арк. 1,56.
Наклад 300 паас. Заказ 718.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў
№ 1/139 ад 08.01.2014, № 3/219 ад 21.12.2013.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 8-215, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: (+375 17) 331 25 42. E-mail: info@4-4.by